ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Камсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 261 (1228) | ЧАЦЬВЕР, 13-га лістапада 1930 г.

МАСКВА, 12. Бюро ЦК УсеЛКСМ прыняло рэзолюцыю па ўнутрыпартыйнаму становішчу, у якой, вітаючы рашэньні партарганаў аб выключэньні з партыі двурушнікаў—ворагаў пролетарскай дыктатуры Руціна, Сьляпкова, Скаўрайскага, Нусінава, зварочваецца з просьбай да ЦК УсеКП(б) і ў ЦКК УсеКП(б) УЖЫЦЬ САМЫЯ ЖОРСТКІЯ ЗАХАДЫ ДА ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ВЫКРЫТАЙ ПРАВА-„ЛЕВАЙ“ ОПОРТУНІСТЫЧНАЙ ГРУПЫ СЫРЦОВА, ЛОМІНАДЗЕ, ШАЦКІНА І ІНШ.

— ЦК УсеЛКСМ, УВЕСЬ ЛЕНІНСКІ КОМСАМОЛ—гаворыцца ў рэзолюцыі — ПАДЦЬВЯРДЖАЕ ПОЎНУЮ СВАЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ БЕЗЗАВЕТНА ЗМАГАЦЦА ЗА ГЕНЭРАЛЬНУЮ ЛІНІЮ ПАРТЫІ І ЯЕ БАЛЬШАВІЦКІ ЦК ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ТАВ. СТАЛІНА.

КОНТРРЭВОЛЮЦЫЙНЫ ТВАР „ПРАМЫСЛОВАЙ ПАРТЫІ“

ПРАЦУЮЧЫ ПА ЎКАЗЦЫ КІРУЮЧЫХ СФЭР БУЙНЫХ БУРЖУАЗНЫХ ДЗЯРЖАЎ, ШКОДНІКІ КОНТРРЭВОЛЮЦЫЯНЭРЫ РЫХТАВАЛІ ВАЕННУЮ ІНТЭРВЭНЦЫЮ СУПРОЦЬ СССР

Абвінаваўчае заключэньне па справе контррэволюцыйнай арганізацыі саюзу інжынэрных арганізацый („прамысловая партыя“)

(Перадаецца ў скарочаным выглядзе)

...на за адной, у цэлым шэрагу галін прамысловасьці, за мінулыя два гады выкрываліся намаганьнямі АДПУ шкодніцкія арганізацыі. Сьледам за шахцінскай шкодніцкай групоўкай была выкрыта шкодніцкая арганізацыя ў НКШЗ. За шкодніцтвам па транспарце насьледавала выкрыцьцё шкодніцкіх арганізацый у вайсковай, тэкстыльнай, будаўнічай прамысловасьці, машынабудаўніцтве, у хэмічнай, залатой, нафтавай і інш. галінах прамысловасьці. Аб радзе выкрытых шкодніцкіх арганізацый і ўжытых мерах савецкі ўрад лічыў патрэбным, шляхам афіцыйных паведамленьняў, паведаміць шырокія масы працоўных.

...на ўсіх матар'ялах гэтых сьледзтва сыстэматычна прыходзіла да вываду аб існаваньні моцна арганізаванага кіруючага цэнтру шкодніцкай работы, натыкаючыся раз-по-раз і ўсюды на шкоднікаў у кіруючым апараце ўсёй народнай гаспадаркі: у ВСНГ і ў асноўным плянуючым органе—Дзяржпляне (аб гэтым гаварылі ўжо даныя сьледзтва па шахцінскаму процэсу). Шматлікасьць гэтых арганізацый, доўгі тэрмін іх існаваньня, унутраная арганізаванасьць іх і зьнітаваньне, а галоўнае, цесны контакт іх з контр-рэволюцыйнай арганізацыяй уцёкшых за мяжу былых уласьнікаў нацыяналізаваных прадпрыемстваў, які ўстанаўляўся сьледзтвам амаль у кожнай справе, сувязь з міжнародным капіталам і, нарэшце, цесная сувязь са шпіёнскай работай ваенных штабаў чужаземных дзяржаў—усё гэта даўно прымусіла савецкую ўладу расцэньваць шкодніцтва не як выпадковую контр-рэволюцыйную групоўку інжынэраў, а перш за ўсё, як пэўны мэтод клясавага змагання з боку буржуазіі, як клясы ў цэлым, якая арганізавана дзейнічала ва ўсіх галінах нашага гаспадарчага будаўніцтва і звыш таго, шукаць кіруючы цэнтр і вагар усёй шкодніцкай работы ня толькі ў асяродзішчы ўсіх іншых арганізацый міжнароднага капіталу, але непасрэдна ва ўрадавых сфэрах буйнейшых буржуазных дзяржаў Эўропы, якія фактычна кіравалі дзеяньнямі шкодніцкіх арганізацый і выкарыстоўвалі іх, як сваю палітычную агэнтуру.

Да гэтага вываду сыстэматычна прыходзіла сьледчая ўлада пры распрацоўцы даных аб шкодніцкіх арганізацыях на падставе непасрэдных матар'ялаў сьледзтва. Магутны наступальны ход наперад Савецкага Саюзу на гаспадарчым фронце, посьпехі соцыялістычнага будаўніцтва выключалі для ўсіх гэтых шкодніцкіх арганізацый ажыцьцяўленьне іх замыслаў без дапамогі звонку, без умяшальнасьці ў барацьбу супроць Савецкага Саюзу, якая праводзілася імі, больш магутных сіл арганізаванага міжнароднага капіталу ў абліччы яго буржуазных урадаў, якія апіраюцца на ўзброеную сілу. Узрастаючая, па меры посьпехаў Саюзу, варожая актыўнасьць буржуазных дзяржаў у адносінах да Савецкага Саюзу, бесьперапынныя провокацыйныя спробы ўцягнуць яго ў вайну, нарэшце агалтэлы шум, які ўсякі раз узьнімала буржуазная прэса пасьля актаў рэпрэсій савецкай улады супроць адкрытых шкоднікаў—усё гэта з няўмольнай лёгікай прыводзіла да тых-жа высноў і гаварыла аб наяўласьці пэўнай арганічнай сувязі паміж работай шкоднікаў і антысавецкай палітыкай буржуазных дзяржаў. Таму сюды няўхільна павінны былі весьці ніткі ад шкодніцкіх арганізацый. Такавы былі высновы аб арганізацыйных асновах і палітычных пэрспэктывах шкодніцтва, да якіх сыстэматычна прыходзіла сьледчая ўлада пры распрацоўцы паасобных конкрэтных спраў.

Аднак, толькі матар'ялы па справе выкрытай нарэшце, АДПУ контр-рэволюцыйнай арганізацыі, якая называла сябе „прамысловай партыяй“ або „Саветам саюзу інжынэрных арганізацый“, аб'яднала ў адзіную арганізацыю ўсе паасобныя шкодніцкія арганізацыі па розных галінах прамысловасьці і дзейнічала ня толькі паводле ўказаньняў міжнародных арганізацый былых расійскіх і чужаземных капіталістых, але і ў сувязі і па простых наказаньнях кіруючых сфэр і генэральнага штабу па падрыхтоўцы ўзброенае ўмяшальнасьці і ўзброенага зьвяржэньня савецкай улады, — пацьвердзілі цалкам гэтыя вывады. Паказаньні прыцягнутых па гэтай справе выкрываюць у выстарчальнай меры гэтага роду сувязь.

Лічачы выключна важным зараз-жа перадаць гласнаму суду асоб, якія паставілі ў выніку сваёй антыдзяржаўнай злачыннай дзейнасьці шырэйшыя масы працоўных Саюзу ССР і Заходняй Эўропы пад простую пагрозу ў бліжэйшым будучым новай вайны супроць народаў СССР,—прокуратура рэспублікі прапануе ўвазе Вярхоўнага Суда Саюзу ССР у гэтай справе іменна гэты бок злачыннай дзейнасьці, пакідаючы пакуль у баку іншыя стораны справы, якія патрабуюць дадатковай сьледчай распрацоўкі. Прокуратура рэспублікі прад'яўляе да прыцягнутых па справе асоб абвінавачаньне па арт. 58, п. п. 3, 4 і 6 КК РСФСР.

Абвінаваўчае заключэньне на 75 старонках друкаванага тэксту падрабязна выкладае гісторыю ўзьнікненьня цэнтру контр-рэволюцыйных шкодніцкіх арганізацый, палітычную і эканамічную праграму шкоднікаў, ролю французскага ўраду ў падрыхтоўцы інтэрвэнцыі і сувязь яго са шкодніцкай арганізацыяй, дзейнасьць „прамысловай партыі“ па падрыхтоўцы інтэрвэнцыі ў СССР, зьмест работы шкодніцкага цэнтру за 1928-29 г. г., а таксама работу ЦК „прампартыі“, у 1930 годзе. Далей, абвінаваўчае заключэньне падае даныя аб злачыннай рабоце ЦК „прампартыі“ па падрыхтоўцы эканамічнага крызісу ў 1930 г.

У заключэньні паказваюцца даныя аб сувязі ЦК прампартыі з Французскай агэнтурай у Маскве і наогул аб яе шпіёнскай і дывэрсыйнай рабоце. Пасьля пералічэньня ўсіх фактаў злачыннай дзейнасьці шкодніцкай арганізацыі абвінаваўчае заключэньне падводзіць наступны вынік:

Злачынная супроцьдзяржаўная дзейнасьць ЦК, з „прамысловай партыі“ за апошнія два гады выявілася: а) у працягу і ўзмацненьні агульнага шкодніцтва для разбурэньня гаспадарчага жыцьця — работа, распачатая яшчэ інжынэрна-тэхнічным цэнтрам да стварэньня ЦК прампартыі; б) спэцыяльнай шкодніцкай рабоце па зрыву плянавага будаўніцтва шляхам стварэньня крызісаў у забясьпечаньні аналам, мэталям у энэргетычнай гаспадарцы, тэкстыльнай прамысловасьці і інш. галінах, накіраванай да стварэньня агульнага гаспадарчага крызісу ў 1930 годзе,—год, прызначаны для чужаземнай ваеннай інтэрвэнцыі ў мэтах палягчэньня і дапамогі гэтай інтэрвэнцыі; в) у спэцыяльнай шпіёнскай рабоце па заданьнях французскага генэральнага штабу і існуючага ва Францыі гандальпрому па паведамленьні даных аб эканоміцы нашай краіны і спэцыяльных сакрэтных вестак, якія датычаць абароны, у мэтах палягчэньня чужаземнай ваеннай інтэрвэнцыі; г) у ваеннай рабоце, накіраванай да дэзорганізацыі чырвонай арміі і падрыхтоўкі здрадніцкіх дзеяньняў з боку яе паасобных часьцей і каманднага складу—у тых-жа мэтах палягчэньня чужаземнай інтэрвэнцыі; д) у дывэрсыйнай рабоце, накіраванай спэцыяльна на разбурэньне вытворчых сіл савецкай прамысловасьці і тылу чырвонай арміі ўжо непасрэдна ў момант інтэрвэнцыі; зьмест гэтай злачыннай дзейнасьці цалкам і поўнасьцю абгрунтоўвае прад'яўленае абвінавачаньне па арт. 58, п. п. 3, 4 і 6 КК РСФСР.

На аснове выкладзенага аддаюцца суду спэцыяльнае прысутнасьці Вярхоўнага суда Саюзу ССР:

1. Рамзін, Леанід Канстантынавіч, 1887 г. нарадж., грамадзянін СССР, проф. МВТУ і дырэктар цёпла-тэхнічнага інстытуту, паводле ўласнага прызнаньня—член нелегальнай прампартыі;

2. Калінькікаў, Іван Андрэевіч, 1874 г. нарадж., грамадзянін СССР, займаў пасаду нам. старшыні вытворчага сэктару Дзяржпляну і профэсар ваенна-паве ранай акадэміі і інш. вышэйшых навучальных установу, паводле ўласнага прызнаньня—член нелегальнай прампартыі.

3. Ларычаў, Віктар Аляксеевіч, 1887 году нарадж., грамадзянін СССР, інжынэр, займаў пасаду старшыні паліваі сэкцыі Дзяржпляну, паводле ўласнага прызнаньня—член нелегальнай прампартыі;

4. Чарноўскі, Мікалай Францавіч, 1868 г. нараджэньня, грамадзянін СССР, профэсар розных вышэйшых тэхнічных навучальных установу, старшыня навукова-тэхнічнага савету ВСНГ, член нелегальнай прампартыі;

5. Фядотаў, Аляксандр Аляксандравіч, 1864 г. нараджэньня, грамадзянін СССР, профэсар розных ВТНУ, старшыня колегіі навукова-дасьледчага тэкстыльнага інстытуту, паводле ўласнага прызнаньня—член нелегальнай прамысловай партыі;

6. Купрыянаў, Сяргей Віктаравіч, 1871 г. нарадж., грамадзянін СССР, тэхнічны дырэктар орг.-тэкстылю ВСНГ СССР, інжынэр-мэханік, паводле ўласнага прызнаньня—член нелегальнай прампартыі—па абвінавачаньню ў тым што:

1. Уступіўшы ў розны час у шкодніцкія арганізацыі ў паасобных галінах прамысловасьці і паставіўшы сабе мэтаю—шляхам ужываньня розных форм шкодніцтва—нанесьці найбольшыя страты гаспадарчаму будаўніцтву СССР для падрыву савецкай улады і палягчэньня ўмоў аднаўленьня ўлады буржуазіі, праводзілі на працягу раду год гэту шкодніцкую дзейнасьць, аб'яднаўшыся дзеля гэтага, па ініцыятыве расстралянага за ўдзел у контр-рэволюцыйнай арганізацыі і арганізаванае шкодніцтва Пальчынскага і засуджанага па шахцінскаму процэсу за шкодніцтва Рабіновіча,—у адзіную арганізацыю, называную імі „інжынэрна-тэхнічным цэнтрам“, у мэтах сыстэматычнага і плянамернага кіраўніцтва шкодніцтвам ва ўсіх галінах прамысловасьці.

II. У далейшым, пераканаўшыся на аснове ўзрастаючых посьпехаў соцбудаўніцтва ў бясплённасьці сваіх спроб затрымаць гэта будаўніцтва і забясьпечыць выключна шляхам шкодніцтва аднаўленьне эканамічнага і палітычнага панаваньня буржуазіі і пераканаўшыся ў неабходнасьці ўзброенага зьвяржэньня савецкай улады і гвалтоўнага аднаўленьня капіталістычнага парадку, рэорганізавалі ў гэтых мэтах сваю арганізацыю ў палітычную партыю, якая назвала сябе „прамысловай партыяй“, і пашырылі дзейнасьць гэтай арганізацыі, шляхам устанаўленьня сувязі і ўзгадненьня работы з іншымі контр-рэволюцыйнымі арганізацыямі, якія стварыліся ў той час, у прыватнасьці, контр-рэволюцыйнай групай Кандрацьцева-Чаянава, прынялі на сябе кіраўніцтва прамысловай партыяй увайшоўшы ў склад яе ЦК.

III. Пераканаўшыся далей у немагчымасьці арганізацыі ўзброенага паўстаньня ўнутры краіны, зьвяржэньня савецкай улады і рэстаўрацыі капіталізму без дапамогі звонку, увайшлі ў зносіны са створанай за рубяжом аб'яднанай арганізацыяй уцёкшых за мяжу ворагаў народу,—б. уласьнікаў нацыяналізаваных прадпрыемстваў, якія аб'ядналіся там у так званы „гандлёва-прамысловы камітэт“, з паасобнымі членамі якога яны мелі зносіны і да гэтага часу на глебе шкодніцтва, і па згодзе з апошнім, накіравалі сваю шкодніцкую работу на падрыхтоўку спрыяючых умоў для чужаземнае ўзброенае ўмяшальнасьці, скарыстоўваючы дзеля гэтага фінансавую дапамогу ад гандальпрому і чужаземных дзяржаў.

IV. Адначасова, праз гандльпром увайшлі ў злачынныя зносіны з падрыхтоўваючымі ваенны напад на СССР кіруючымі коламі Францыі ў асобе былога галавы французскага ўраду Пуанкарэ і міністра замежных спраў Брыяна і распрацоўваючымі паводле ўказаньняў апошніх плян ваеннага нападу на СССР афіцэрамі генэральнага штабу Францыі Жанэнам і Рышарам, зрабіўшы тым самым акт простай дзяржаўнай здрады.

V. У далейшым, у разьвіцьцё задуманай здрадніцкай дзейнасьці: а) накіравалі сваю шкодніцкую работу на разбурэньне гаспадарчага жыцьця краіны, на стварэньне крызісу ў асноўных галінах прамысловасьці да 1930 году, г. зн. да тэрміну, паказанаму генэральным штабам Францыі для ваеннай інтэрвэнцыі супроць СССР; б) устанавіўшы, па дагаворанасьці з генэральным штабам Францыі, асабістую сувязь праз спэцыяльна ўмоўленых дзеля гэтага асоб французскай службы К і Р., атрымлівалі і выконвалі заданьні генэральнага штабу Францыі па шпіянажу, дастаючы, згодна заданьняў гэтага штабу, патрэбныя весткі сакрэтнага характару, якія датычылі ваенных сіл і абароназдольнасьці Саюзу ССР; в) па прапанове таго-ж генэральнага штабу арганізавалі спэцыяльную ваенную групу, якая мела задачай падрыхтаваць разлажэньне Чырвонай арміі, аж да паасобных здрадніцкіх актаў з боку паасобных часьцей у часе інтэрвэнцыі; г) па прапанове таго-ж генэральнага штабу Францыі стварылі ў сваёй арганізацыі дывэрсыйную групу для аказаньня дапамогі чужаземным ваенным інтэрвэнтам, шляхам выбуху грамадзкіх пабудоў, электрастанцый, чыгунак, ваенных заводаў і фабрык. Усе гэтыя дзеяньні прадугледжаны артыкулам 58, п. п. 3, 4 і 6 КК РСФСР.

7. Бочкін, Уладзімер Іванавіч, 1891 г. нарадж., грамадзянін СССР, навуковы сэкратар цёпла-тэхнічнага інстытуту і загадчык аддзелу кіраўніцтва навукова-дасьледчага сэктару ВСНГ СССР, паводле ўласнага прызнаньня зьяўляўся членам нелегальнай прамысловай партыі,—па абвінавачаньню ў тым, што, увайшоўшы ў арганізацыю прампартыі і ведаючы аб мэтах і задачах апошняй, выконваў яе заданьні, у прыватнасьці ўваходзіў непасрэдна ў зносіны ў мэтах шпіёнскай і здрадніцкай дзейнасьці з асобамі французскай службы з грамадзянамі К. і Р., перадаючы патрэбныя ім сакрэтныя весткі, атрымліваючы і выконваючы іх заданьні—што прадугледжана арт. 58 п. п. 3 і 6 КК РСФСР.

8. Сыткін, Ксенафонт Васільлевіч, 1878 г. нарадж., грамадзянін СССР; інжынэр усесаюзнага тэкстыльнага сындыкату,—па абвінавачаньню ў тым, што, зьяўляючыся членам тэй-жа контр-рэволюцыйнай шкодніцкай арганізацыі, ведаючы аб пастаўленых ёю мэтах, прымаў на сябе выкананьне адпаведных заданьняў у галіне шкодніцкай работы і апрача таго, асабіста ўваходзіў у зносіны з дзеячамі гандльпрому, у бытнасьць сваю за мяжой, у прыватнасьці, з Канавалавым, што прадугледжана арт. 58, п. п. 4 і 6 КК РСФСР.

Абвінаваўчае заключэньне па ўзгадненьню з прокурорам Вярхоўнага суда Саюзу ССР, зацьвердзіў пракурор Расійскай Соцыялістычнай Фэдэрацыйнай Савецкай Рэспублікі Крыленка.

ЗА МЯЖОЮ

Кітайская Чырвоная армія разграміла нанкінскую дывізію

Заняты гор. Пінцзян

ПЭЙПІН, 10. Паводле паведамленьня з Ханькоу, 8 і 16 Чырвоныя арміі нанесьлі паражэньне 30-й нанкінскай дывізіі і занялі Пінцзян (провінцыя Хунань, на паўночны ўсход ад Чанша). 60-ая і 61-я дывізіі нанкінскіх войск прабуюць зноў захапіць Пінцзян. Атрады Чырвонай арміі пагражаюць Наньчану, Цзюцзяну і Хукоу (у провінцыі Цзянсі).

Прагнаць налётчыкаў!

Тэрор белагвардзейскіх банд у раёне заходняй лініі КУ чыгункі

ТОКІЁ, 10. Газэта „Шэньсі Шы-Бао“ паведамляе аб новых штукарствах белагвардзейскіх банд у раёне заходняй лініі КУ чыгункі. Напады белагвардзейцаў тэрарызуюць мясцовае насельніцтва. Газэта піша:—„Ня гледзячы на тое, што мясцовым уладам з цэнтру дана распараджэньне ліквідаваць белагвардзейскія банды, становішча не зьмянілася“.

Новы пэрл ангельскай лібэральнай партыі

ЛЁНДАН, 5. Ангельская лібэральная партыя апублікавала сваю праграму „барацьбы з беспрацоўем“. Праграма „надзвычайных захадаў“ лібэралаў робіць проста сьмехатворнае ўражаньне, бо яна зьмяшчае толькі агульныя фразы і добрыя пажаданьні. Асноўная мэта праграмы—патрабаваньне „рашучага“ зьніжэньня кошту продукцыі. „Але ўся справа ў тым, што ў аснову экономічнага крызісу ў Ангельшчыне ляжыць іменна немагчымасьць зьнізіць сабекошт продукцыі. Намечаныя праграмай мерапрыемствы ў бліжэйшыя дні павінны даць работу ня менш як 650-700 тысяч беспрацоўным, тады як зараз у Ангельшчыне налічваецца амаль 2 з паловай мільёны беспрацоўных.

Праграма ўрадам Макдональда адхілена.

9 комсамольцаў прыгавораны да 27 год катаржнай турмы

РЫМ, 11. Асобы трыбунал прыгаварыў сёньня 9 міланскіх рабочых—комсамольцаў агулам да 27 год катаржнай турмы за актыўную комсамольскую работу. За апошнія 10 дзён гэта ўжо 4-ы катаржны прысуд рабочым, вынесены асобым трыбуналам.

ФАБРЫКА „ЗЬВЯЗДА“ ЗДАЕ ПОЗЫЦЫ

ПОЛІТЫЧНАЯ СЬЛЕПАТА, ГАНЕБНАЯ НЕПАВАРОТНАСЬЦЬ ТРЫКУТНІКА І КОЛЕКТЫВУ ЛКСМБ Ф-КІ „ЗЬВЯЗД АДАРВАНАСЬЦЬ АД РАБОЧЫХ МАС—СТВАРЫЛІ ЦЯЖКОЕ СТАНОВІШЧА З ВЫКАНАНЬНЕМ ПРАМФІНПЛ

СТАЦЬ НА ЧАЛЕ ЎСЁ ЎЗРАСТАЮЧАГА ЭНТУЗІЯЗМУ І ІНІЦЫЯТЫВЫ РАБОЧЫХ, АЎЛАДАЦЬ БАЛЬШАВІЦКІМІ ТЭМПАМ РАБОТЫ, НАНЕСЬЦІ РУЙНУЮЧЫ ЎДАР ПРАВА-ОПОРТУНІСТЫЧНАМУ РУМЗАНЬНЮ—НЕАДКЛАДНАЯ БАЯВАЯ ЗАДАЧА КІРАЎНІЦТВА ФАБРЫКІ

Фанерная фабрыка „Зьвязда“ (ст. Капцэвічы), як у галіне самой вытворчасьці, так асабліва ў галіне двайнасьці заводзкага трыкутніка і комсамольскага колектыву, знаходзіцца ў надзвычайна цяжкім становішчы, якое прымушае біць трывогу.

Гавораць лічбы

За кастрычнік месяц асобнага кварталу фабрыка, згодна заданьню, павінна была выступіць 1870 к-м фанеры, выпусьціла-ж за гэты месяц толькі 1560 к-м. Такім чынам недавыкананьне вытворчай програмы па фанеры складае 310 к-м,ці 16,6 проц.

У кастрычніку 3-я зьмена не працавала 10 дзён, альбо 20 прэса-зьмен, што дало страту 180 к-м фанеры. Усяго за месяц прэсы прасталі 79 гадзін, што, па самых скромных падліках, у сваю чаргу дало страту ў 99 к м фанеры. Наяўнасьць такой вялікай недавыпрацоўкі фанеры за кастрычнік месяц галоўным чынам тлумачыцца тым, што машыны і варштаты ня былі поўнасьцю нагружаны з-за нераспарадчасьці адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсоналу фабрыкі. Фабрыка мае 4 машыны, зусім ясна, што пры 3-х зьменнай рабоце прадпрыемства поўнасьцю павінны быць загружаны 12 машына-адзінак. Аднак, кожныя рабочыя суткі працуюць у сярэднім толькі 10-11 машына-адзінак. Такім чынам 1-2 машына-адзінкі рэгулярна „прагульваюць“.

Машыны, якія працуюць, таксама ня маюць поўнай нагрузкі. Замест зусім магчымай да выпрацоўкі пры 3-зьменнай рабоце нормы ў 90 прэсаў, выпрацоўваецца толькі 68-70 прэсаў.

Заўжды гатовы... об'ектыўныя прычыны

Здавалася-б, што гэтыя, сапраўды трывожныя лічбы, павінны былі-б прымусіць партыйную, комсамольскую, профэсыйную організацыі і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсонал фабрыкі больш энэргічна ўзяцца за адшуканьне прычыны цяжкога становішча прадпрыемства, па-бальшавіцку мобілізаваць масы на ліквідацыю прарыву.

Аднак гэтага мы ня маем.

Кіраўніцтва і дагэтуль ня бачыць сапраўдных прычын прарыву, ня бачыць, чаму вытворчая програма прадпрыемства выконваецца нездавальняюча.

Вось комплекс „об'ектыўных прычын“ прарыву ў тлумачэньні паасобных кіраўнікоў фабрыкі.

1. Адсутнасьць альбуміну (клеявых рэчаў);

2. Масавая хворасьць рабочых на грып і жывот, а адгэтуль і вымушаныя прагулы;

3. Недахоп кваліфікаванай рабочай сілы;

4. Вялікі процант новых рабочых, якія ня ведаюць вытворчасьці, адсюль зьніжаецца норма і якасьць выпушчанай продукцыі.

Прыходзіцца толькі дзіву давацца—чаму гэта сярод такіх „паважных“ прычын забыліся аб дажджлівай восені, міжнародных абставінах і падобных.

Як кваліфікаваць разважаньні кіраўнікоў фабрыкі аб „прычынах“?

Гэта ня іначай—„аналіз“ стану вытворчасьці праз капітулянцкія права-опортуністычныя акуляры.

Небясьпечнасьць становішча ўскладняецца яшчэ тым што падобныя настроі пануюць і сярод паасобных партыйцаў і комсамольцаў—нават адказных таварышоў.

Як расцэньваць такі факт? На агульна-рабочым сходзе пам. дырэктара, член партыі тав. Некрашэвіч, у сваёй прамове даводзіць, што вызначаныя нормы выпрацоўкі немажліва выканаць. За ім выступае дырэктар, тав. Машкоўскі і прымірэнча адносіцца да гэтай прамовы і „ўстановачак“.

Т.т. Машкоўскі і Некрашэвіч прызналі памылковасьць сваіх выступленьняў толькі пасьля настойлівых патрабаваньняў рабочага сходу і вынясеньня спэцыяльнай пастановы бюро партыйнага колектыву.

Завком таксама не рэагаваў на наяўнасьць цяжкога становішча з выкананьнем прамфінпляну, а цягнуўся ў хвасьце опортуністычных настрояў—„об'ектыўных прычын“.

Опортуністычныя падпявалы з комсамольскага кіраўніцтва

Асабліва ўвагі заслугоўвае практычная дзейнасьць комсамольскага колектыву фабрыкі.

Праца колектыву за апошні час недапушчальна паслабла (ці не дажджлівае асеньняе надвор'е таму віною?)

Усё часьцей сталі прарывацца хваравітыя зьявы ў колектыве — групы комсамольцаў прымаюць удзел у гулянках, выпіўцы і інш.

Нядаўна было распушчана бюро ячэйкі лушыльнага цэху за поўную бязьдзейнасьць.

Пры надзвычайна вялікай колькасьці маладняка, новапрынятых на вытворчасьць рабочых, узрост колектыву недапушчальна панізіўся.

Культурна-масавая выхаваўчая праца закінута. Кіраўніцтва ў адзін голас падпявае опортуністым з дырэкцыі аб наяўнасьці прыведзеных вышэй об'ектыўных прычын і непасільнасьці нормы.

Надзвычайна характэрна прывесьці выступленьне старшыні экономсэкцыі колектыву тав. Палтарына на райКСМ конфэрэнцыі (Петрыкаў).

Кажучы аб выкананьні прамфінпляну, тав. Палтарын тлумачыў наяўнасьць прарыву тымі самымі „об'ектыўнымі прычынамі“ і ні слова не сказаў аб недапушчальнай бязьдзейнасьці колектыву.

Удзельнікі конфэрэнцыі далі гэтай прамове самы бязьлітасны адпор і кваліфікавалі, як яўна права-опортуністычную.

Не зважаючы на гэты вурок, сэкратар колектыву—тав. Чарачкевіч, у сваёй прамове солідарызаваўся з выступленьнем тав Палтарына, і абураўся тым, што „нашай дэлегацыі кінулі абвінавачваньне ў права-опортуністычных выступленьнях“. Тав. Чаранкевічу таксама „накастылялі“.

З паданага ясна відаць, што комсамольскі колектыў фабрыкі „Зьвязда“ не стаіць на чале бальшавіцкага змаганьня за прамфінплян, што ён бязьдзейнічае і ганебна плянецца ў хвасьце адсталых настрояў найбольш несьвядомай часткі рабочых і па сутнасьці спаўзае ў балота опортунізму.

Кіраўніцтва Петрыкаўскага РК ЛКСМБ ня ведае чым жыве колектыў, не аддае яму ніякай увагі. Аб гэтым сьведчыць хоць-бы той факт, што ў прадстаўленай райконфэрэнцыі справаздачы РК ні слова не гаварылася аб фабрыцы. РК ЛКСМБ ня даў адпору шкодным опортуністычным настроям кіраўніцтва комсамольскага колектыву фабрыкі „Зьвязда“.

„Ціхамірны ваяка“

Надзвычайна цікава тое, што ЦП саюзу ня ведае аб сапраўдных прычынах цяжкога становішча заводу „Зьвязда“.

Калі папрасілі намесьніка старшыні праўленьня ЦП растлумачыць сутнасьць справы, той адказаў: „прычыны прарыву трэба тлумачыць новым прылівам рабочых, нездавальняючай пастаноўкай справы забясьпечаньня“ і далей заявіў—„наогул становішча фабрыкі „Зьвязда“ ня дрэннае. Ёсьць і горай. З такім становішчам можна мірыцца. Больш аддаць увагі заводу ЦП ня мае магчымасьці“.

З чым гэта вы, паважаны таварыш „зам“, лічыце магчымым мірыцца? З прарывам у 16,6 проц.?

У час, калі партыя кліча змагацца за кожны аркуш фанеры, за кожную клёпку,—для „зама“ прарыў у 310 кубічных мэтраў фанеры—„парачка пусьцякоў“.

Як гэта называецца?

Па нашаму — правы опортунізм горшага гатунку.

У чым-жа караняцца сапраўдныя прычыны цяжкога становішча на прадпрыемстве?

Асноўнае ў тым, што яшчэ дагэтуль кіраўніцтва фабрыкі,—парт., проф. і КСМ організацыі, — плятуцца ў хвасьце адсталых настрояў, не даюць гэтым, па сутнасьці права-опортуністычным, настроям рашучага, бязьлітаснага адпору

Кіраўніцтва ня стала на чале творчай ініцыятывы, энтузіязму рабочых мас, не пераключыла работу на больш высокую ступень соцыялістычнага спаборніцтва, не аўладала сапраўднымі ўдарнымі бальшавіцкімі тэмпамі работы.

Асноўнае ў тым, што замест такога бальшавіцкага тлумачэньня сутнасьці справы, а адгэтуль і правільнай орыентоўкі і мобілізацыі рабочых мас на ліквідацыю прарыву,—кіраўніцтва пачало вышукваць „об'ектыўныя прычыны“, размагнічваць масу.

Вось факты

1. Бліскучы вопыт рабочых Гомельскага Палесдруку—організацыя вытворчых манэўраў, гэты вузор сапраўды бальшавіцкага энтузіязму і творчасьці—не прымяняўся на фабрыцы „Зьвязда“. Пытаньне аб манэўрах нідзе нават і не аб... валася, нібыта „за недахопам ...

На фабрыцы няма ніводнае ... ное брыгады. Недапушчальна слабла ўдарніцтва, зусім не ... ца вучот вынікаў ударніцтва і спаборніцтва. Соцыялістычна... трактаныя рабочых за пра... ствам да канца 5-годкі пра... зусім слаба. Па зьвестках за... закантрактавалася ўсяго 108 рабочых.

2. Рабочыя прапановы па ... яналізацыі вытворчасьці ня ... юцца і ня ўлічваюцца.

Кіраўніком фабрыкі, бачы... хапае часу абгаварыць ра... прапановы на паседжаньні ... вытворчай нарадзе. Бюро ра... лізацыі не працуе. Гэты ка... нейшы мэтад прыцягненьня ... чых да актыўнага ўдзелу ў ... ніцтве сваёй вытворчасьці зус... ўжываецца.

3. Пастанова ЦК КП(б)Б а... пуску трох ганаровых сьцягаў ЦК КП(б)Б, ЦК ЛКСМБ і ... на заводзе не абгаварвалася. ... чыя масы не мобілізаваны ... рацьбу за сьцягі.

4. Памылкі опортуністычна... раўніцтва ЦСПСБ, якія даст... асьвятляліся ў пашым дру... заводзе таксама не абгаварва...

Можна было-б прывесьці ... істужку сапраўдных прычын, ... характарызуюць становішча фа...

Па-бальшавіцку перабудавацца, стаць на чале рабочай ініцыятывы

Вось асноўная задача трык... і КСМ колектыву фабрыкі „Зь... Партыйнае кіраўніцтва фабры... даўна аднаўлена. Зараз райком... ты і парт'ячэйка вядуць ра... непрымірымую лінію бара... памылкамі і нездаровымі наст... на фабрыцы. Адміністрацыя ф... кі—дырэктар і яго намесьнік (... двз вылучэнцы) — прызналі памылкі. Трэба спадзявацца, пры рашучым выпраўленьні ... лак, узмацненьні ўвагі і кіра... тва раённых кіруючых організа... а ў першую чаргу—РК КП(б)... ЛКСМБ, завод „Зьвязда“ ў найкарацейшы тэрмін ліквідуе ... рыў і па-бальшавіцку спра... пастаўленымі перад ім задача...

П. Янко...

Праз опортуністычныя акуляры „об'ектыўных прычын“



кіраўніцтва колектыву ЛКСМБ ф-кі „Зьвязда“ тлумачыць прарыў наяўнасьцю хваробы жывата і грыпу.

За самакрытыку—вымова

Шмат разоў пісалася, што на фабрыцы „Зьвязда“ самакрытыка не ў пашане. Ёсьць выпадкі ганеньня на рабкораў як з боку партыйнай ячэйкі, так і бюро ЛКСМБ к-ву. За ганеньне рабкораў т. т. Сухацкага і Коціка Ш. былы сэкратар партячэйкі Коган меў спагнаньне ад партыйных органаў.

Але і зараз ня ўсё добра. Бюро колектыву ЛСМБ організавала вечар самакрытыкі. За тое, што тав. Рушко, пасьмеў крытыкаваць сэкратара колектыву т. Чаранкевіча, той паставіў пытаньне аб вывадзе т. Рушко з залі, т. Бінімовіч крытыкаваў Эканомправа т. Палтаран перад усімі папярэдзіў т. Бінімовіча, які выступіў супроць яго з крытыкай: „Ведаеце, таварышы, што ўсё гэта запісваецца, а потым да гаваруной мы прымем меры“. Так яно і было. Тав. Бінімовіч атрымаў суровую вымову за сваё крытычнае выступленьне на сходзе.

Такім чынам самакрытыка ізноў заціскаецца ў комсамоле. Комсамольскае кіраўніцтва на фабрыцы не адчуваецца. Няма і дысцыпліны. Тав. Чаранкевіч вельмі „самалюбівы хлапец“, ня ўмее падыходзіць да моладзі і вельмі рэзка адказвае, стукаючы па стале.

Шмат комсамольцаў не падпісалася на пазыку „5-годка—у 4 гады“, ня добра трымаюць сябе на вытворчасьці. На вечары ўдарнікаў было ўсяго 13 комсамольцаў, але і тыя, замест прыняць актыўны ўдзел, перашкаджалі другім працаваць (Доўбня, Чырва, Бутвілоўскі і інш.). Трэба прыняць рашучыя меры з тым, каб аздаравіць становішча комсамольскага колектыву фабрыкі „Зьвязда“.

Ш.

КРЫТЫКА НЕ Ў ПАШАНЕ

26-га кастрычніка адбыўся агульны сход 2-га концэнтру Капцэвіцкай ФЗС па пытаньню аб крытыцы і самакрытыцы. Вучні прымалі актыўны ўдзел і разам з настаўніцтвам ахвотна выпячвалі хібы школы. Але некаторыя настаўнікі комсамольцы т. т. Гайманаў і Нікіцін—выступалі супроць крытыкі Тав. Нікіцін у сваім выступленьні заявіў: „Такі сход вам нічога ня дасьць. Вучні топчуцца на гэтым пытаньні дарэмна, бо ніякіх вынікаў не атрымаюць“. Другі настаўнік. тав. Гайманаў, прышоў на сход „фон-баронам“, сеў і закурыў, пускаючы дым. вучні зрабілі яму заўвагу і п... скінуць шапку і выйсьці пакур... калідор, дык ён заявіў:—„Гэты ... не здаровы. Такая прапанова ... свайму настаўніку ёсьць груб... Прапаную перадаць іхны ўчы... школьную раду“.

Гайманаў і Нікіцін імкнуліся ... самым заціснуць самакрытыку, рэдзіўшы вучняў на другі раз... манаў займаецца ганеньнем на ... яшчэ з мінулага году.

Алесь Чар...

ПАТРАБУЕМ ВЫШЭЙШАЙ МЕРЫ ПАКАРАНЬНЯ

Прачытаўшы ў газэце „Чырвоная Зьмена“ ад 10 лістапада ... тар'ялы аб зьверскім нападзе клясава-варожых элемэнтаў на ... мольцаў-актывістых т. т. Іофэ і Бдзірая, якія ажыцьцяўлялі ... партыі па соцыялістычнаму будаўніцтву, мы, курсанты раённых ... ных работнікаў, патрабуем ад пролетарскага суда вышэйшай пакараньня над варожымі элемэнтамі, якія выступілі супроць ... ных грамадчыкаў-комсамольцаў.

По даручэньню курсантаў, курсант— Хірэві...

Цяжкая на пад'ём

На Віцебскай абутковай фабрыцы імя Лекерта пачаліся вытворчыя манэўры. Складзен двесяцідзённы плян конкрэтных мерапрыемстваў у час манэўраў.

Комсамол не бярэ ўдзелу ў ... справе. Лёгкая кавалерыя ... ся цяжкаю на пад'ём.

Неабходзен пералом.

Маргер...

ТОК ДАДЗЕН

Ужо в вечару, перад днём сьвяткаваньня 13-ай гадавіны Кастрычніка, Асінстан іскрыўся ў скрыжаваньнях электычных гірлянд.

Лёзунгі, плякаты, аркі, электрычныя транспаранты—расквецілі галоўны корпус Асінэльстану і яго пасёлкі—Арэхі, Выдрыцу.

У чорную ноч сярод балот і лясоў крычалі рупары гучнагаварыцеляў.

— Альлё! Альлё! Альлё! Гаворыць Асінбуд! Гаворыць Асінбуд,—крычалі рупары.—Зараз адбудзецца пробны пуск турбагенэратара... пробны пуск турбагенэратара.

У вялікай, залітай электрычным бляскам залі, ішла апошняя проба турбагенэратара з пускам электрычнага току па лініям.

***

З 4-й гадзіны ўночы пачалі прыбываць цягнікі з гасьцямі. Першым прышоў цягнік з дэлегацыяй менскіх рабочых. Раніцою прыехалі аршанскія чыгуначнікі. Усьлед за імі, а 11-ай гадзіне раніцы, прыбылі ў Арэхі ўрадавыя цягнікі—з Масквы і Менску.

Члены ЦВК Рэспублікі і Саюзнага ўраду сабраліся ў машыннай залі для пуску станцыі. Вакол турбіны застыгла ганаровая варта.

Старшыня ўрадавай камісіі — тав. Грысэвіч перад пускам адчыніў кароткі мітынг.

Пасьля невялікай прамовы, старшыня СНК БССР—тав. Галадзед—пераразае чырвоную істужку і паварачвае штурвал. Шум турбіны пакрываецца бурай воплескаў.

***

На вялікай плошчы аблямаванай трохпавярховымі мурамі рабочага пасёлку і ўрослымі ў зямлю арэхаўскімі хатамі, у прагалы якіх відаць ланцуг балот, Арэхаўскае возера і цьмяна-сінія пералівы далёкіх лясоў, тав. Грысэвіч адчыняе мітынг, прысьвечаны 13-ай гадавіне Кастрычнікавай Рэволюцыі і ўрачыстаму пуску Сталінстану.

— „Савецкая ўлада плюс электрыфікацыя раўны комунізму". Вось тыя словы Ул. Ільліча, кіруючыся якімі мы праводзілі электрыфікацыю краіны, — гаворыць у сваёй прамове генэральны сэкратар ЦК КП(б)Б тав. Гей. — Мы пакрыем Савецкую Беларусь сеткай магутных электрычных станцый, якія панясуць электра-энэргію фабрыкам заводам і колгаснай вёсцы. Партыя няўхільна ажыцьцяўляе політыку індустрыялізацыі — вось наш лёзунг. Мы будуем і пабудуем соцыялізм.

Царская ўлада вяла політыку нацыянальнага ўціску працоўных і пакінула нам цяжкую спадчыну.

Партыя непахісна праводзіла пасьпяховае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай політыкі.

Мы вялі рашучую барацьбу за чыстату генэральнай лініі партыі супроць усякіх ухілаў, асабліва ў апошнія часы—супроць праваопортуністычных установак. Замест інтэлігенцкага хныканьня і баязьні мы высунулі лёзунг „5-годка—ў чатыры гады" і ажыцьцяўляем яго бальшавіцкімі тэмпамі.

Тав. Гей канчае сваю прамову заклікам да рабочых Асінэльстану—непаслабна змагацца за будаўніцтва сапраўднымі бальшавіцкімі тэмпамі.

— Ад імя ЦВК Саюзу ССР, слова для прывітаньня мае начальнік Энэргацэнтру СССР—тав. Кубяк.

— Сёньнешні пуск першай турбіны Асінстану адбываецца недалёка ад мяжы старога і новага сьвету. Пуск пакуль што толькі адной турбіны—пачатак сур'ёзнага ўкладу ў соцыялістычны падмурак Савецкай Беларусі.

Аб вялікіх плянах электрыфікацыі БССР гаворыць т. Галадзед.

— Мы пачынаем будаўніцтва 2-й раённай электрастанцыі на 72 тысячы кілёват і давядзем Асінаўскую станцыю да 92 тысяч кілёват.

Старшыня ЦВК БССР т. Чарвякоў, кажа аб тым, якім дасканалым вурокам служыць пуск станцыі супроць усякіх ухілістых ад лініі партыі і асабліва супроць правага ўхілу, двурушніцтва, а ў тым ліку і супроць „самабытных" беларускіх нацдэмаў.

Тав. Чарвякоў агалашае пастанову ўраду БССР аб узнагародзе ордэнам працоўнага сьцягу галоўнага інжынэра Алейнікава, яго намесьніка Шаршнёва і рабочых Шлоўта, Сьмірнова, Гаеўскага, Штэера і аб выдачы шэрагу ўзнагарод энтузіястым будаўнікам Асінстану.

Тав. Чарвякоў раздае ўзнагароды гэроям фронту соцыялістычнай будоўлі пад дружныя воплескі ўдзельнікаў мітынгу.

На мітынгу Аршанскі райкамол перадаў чырвоны сьцяг за ўдарныя тэмпы ў рабоце комсамольскаму колектыву Асінбуду.

Колектыў комсамолу, вуснамі свайго сэкратара тав. Каврыжка, заявіў мітынгу, што комсамол Асінбуду будзе і надалей стаяць на варце генэральнай лініі партыі, будзе і надалей у першых шэрагах энтузіястых.

Мітынг скончаны.

Групы экскурсантаў накіроўваюцца на агляд станцыі.

Да позьняе ночы поўняцца клюбы вясельлем. Вечарам разьяжджаюцца дэлегацыі працоўных.

Рубільнікі першай чаргі Сталінстану—уключаны!

Ток дадзен.

А. Л.

Прымаючы ўдзел у падрыхтоўцы ДА X-ГА ЗЬЕЗДУ КОМСАМОЛУ БЕЛАРУСІ,

Ты павінен чытаць і распаўсюджваць „Чырвоную Зьмену"

Ячэйкі ЛКСМБ, змагайцеся за 40000 тыраж газэты да зьезду комсамолу!

„ЛЕВЫЯ" ЛАХМАНЫ ПРАВЫХ ОПОРТУНІСТЫХ

(З ПЕРАДАВОЙ „ПРАВДЫ" ПА РАДЫЁ)

Кулацкая сутнасьць правага ўхілу партыяй дастаткова выкрыта. Актыўная барацьба партыі супроць правых прывяла да поўнай дыскрэдытацыі іх ідэй. Партыя, пасьлядоўна змагаючыся на два франты, адкідаючы з дарогі соцыялістычнага наступу правых і „левых" опортуністых, непамерна павысіла свой аўтарытэт у масах, яшчэ цясьней самкнула свае шэрагі вакол Ленінскага ЦК. І зусім ясна, што на такую партыю, якая налічвае каля 2 мільёнаў членаў, якая загартавана ў жорсткіх сутычках з клясавым ворагам і яго агэнтурай, на такую партыю з адкрытым забралам ісьці немагчыма. У гэтым досыць пераканаліся правыя і „левыя" опортуністыя. Іменна таму, яны прымяняюць цяпер новыя спосабы ў сваёй барацьбе супроць партыі.

Не адважваючыся выступіць проста супроць ленінскай лініі, правыя опортуністыя прыбягаюць к мэтодам двурушніцтва, ашукваньня партыі. Яны ня супроць таго, каб выкарыстаць левую фразэолёгію, як прыкрыцьцё сваіх яўна-правых поглядаў. Брошура кіраўніка права-„лявацкага" бясьпрынцыповага блёку Сырцова ўяўляе сабою пляцформу гэтага блёку, якая цалкам супадае з асноўнымі ўстаноўкамі пляцформы адкрыта-правых опортуністых, хаця ў ёй ня мала ўльтра-рэволюцыйных фраз (у якасьці прыкрыцьця), цалкам узятых з арсэналу контррэволюцыйнага троцкізму.

Сырцоў перш за ўсё накідаецца на недахопы гаспадарчага будаўніцтва, узводзячы гэтыя недахопы ў ступень гаспадарчага крызісу. Падобна таму, як некалі „левыя" опортуністы Стэн, паклёпнічаючы на партыю, абвінавацілі яе ў „паўзучым эмпірызьме", кіраўнік права-„лявіцкага" блёку таксама абвінавачвае партыю ў поўнай бязьпляновасьці гаспадарчага будаўніцтва, у адсутнасьці політыкі прадбачаньня.

„Мы самацёкам,—піша Сырцоў,—даволі сьлепа і неорганізавана ўехалі ў паласу такіх экономічных зьяў, якія зараз зьяўляюцца прадметам трывожнага абгаварэньня ўсёй краіны і ў прыватнасьці даволі інтэнсыўна, хоць і ня правільна, абгаварваюцца ў чаргах".

Для опортуністых ня існуе тых велізарнейшых посьпехаў, якія мае рабочая кляса ў галіне ўвядзеньня пляновага пачатку ў народна-гаспадарчае жыцьцё. Ім таксама няма справы да таго, што аднэю з важнейшых прычын пасьпяховага гаспадарчага разьвіцьця нашай краіны зьяўляецца менавіта тое, што мы вядзем політыку прадбачаньня, а ня „цягнемся фатальна ў хвасьце падзей", як гэта сьцьвярджае Сырцоў. Ці трэба асобна даводзіць, што падобнага роду паклёп выгадны толькі ворагам пролетарскай дыктатуры.

Імкнучыся ўсяляк дыскрэдытаваць гаспадарчую політыку партыі, не шкадуючы густых фарбаў, права-„левы" блёк—Сырцоў—Ломінадзэ—ня маюць нічога супроць таго, каб выставіць сябе ў якасьці абаронцы інтарэсаў рабочае клясы. „Ілжэ-рабочалюбства", як захад у гісторыі нашай партыі ня новы. Ён поўнасьцю запазычан у троцкістых і адкрыта правых опортуністых. Права-„лявацкі" блёк мкнецца дэмагогічна сыграць на настроі адсталых пластоў рабочае клясы. Права-„лявацкі" блёк вуснамі Сырцова паклёпніцкі сьцьвярджае, што „бюрократызацыя, якая прымае за апошні час надзвычайна шырокія памеры, аўтоматычна зьвязвае ініцыятыву рабочых і гаспадарнікаў". Страціўшы чуласьць меры Сырцоў бесцарамонна распраўляецца з тымі велізарнымі дасягненьнямі, якія мае наша партыя і рабочая кляса ў барацьбе з бюрократызмам, за ўтаненьне і спрошчаньне дзяржаўнага апарату, за паварот яго да задач рэконструкцыйнага пэрыоду. Усяму сьвету вядома (гэта ведаюць і нашыя прыяцелі і нашы ворагі), што мінулы год быў годам велізарнага творчага ўздыму рабочых мас і нябачанага размаху творчай ініцыятывы.

Нічым не адрозьніваюцца і па формэ, і па сутнасьці, і сьцьверджэньні, ізноў-жа ўзятыя з троцкісцкага арсэналу, аб „нарастаючым недабрабыце" у матар'яльным становішчы рабочае клясы. Ня верачы „індэксам" і асноўваючыся на сваіх уласных „адчуваньнях", Сырцоў і кампанія не жадаюць лічыцца з фактамі, якія гавораць аб велічэзных дасягненьнях па ты ў галіне палепшаньня матар'яльнага становішча рабочае клясы. Свае няшчырыя клопаты аб павышэньні рэальнай зарплаты опортуністыя з права-„лявацкага" блёку самі-ж і выкрываюць, прапануючы правесьці павышэньне цэн на прамысловыя тавары, а сапраўды гэта-ж, ясна кожнаму, непазьбежна пацягне за сабою зьніжэньне рэальнай зарплаты. Вывад ясны. Дэмагогія аб „нарастаючым недабрабыце" пушчана для таго, каб зганіць політыку партыі, дыскрэдытаваць яе перад адсталымі пластамі рабочых, убіць клін між рабочаю клясай і яе авангардам.

Троцкісцкая фразэолёгія аб заработнай плаце, аб бюрократызацыі і аб скоўваньні ініцыятывы інш., патрэбна была Сырцову і яго прыхільнікам для таго, каб скрыць свае сапраўды правыя, паражэнчыя, капітулянцкія позіцыі.

Партыя даволі вырасла, каб зразумець, што за гутаркамі аб бясплянавасьці, аб гаспадарчых недахопах скрываецца права - опортуністычнае сьцьвярджэньне аб непасільнасьці тэмпаў, аб немагчымасьці вырашэньня гаспадарчых задач, таму што мы ўсе на адну-дзьве галавы ніжэй задач, высоўваемых жыцьцём, аб нятрываласьці і пераацэнцы колгаснага будаўніцтва. Опортуністыя ня вераць, што ў краіне ўжо адбыліся такія экономічныя зрухі, якія даюць поўную падставу сьцьвярджаць, што нам удасца павярнуць вёску на новы шлях, на шлях колектывізацыі, забясьпечыць тым самым пасьпяховае будаўніцтва соцыялізму ня толькі ў горадзе, але і ў вёсцы" (Сталін). Скептык з опортуністычнага лягеру яшчэ паглядзяць колькі і што прынясе трэці „праверачны" год. Яны яшчэ не пераканаены ў трываласьці колгасаў. Гэта нічым не адрозьніваецца ад старое бухарынскае песьні, што колгасы —справа далёкай будучыні.

Партыя пры поўным падтрыманьні ўсяе рабочае клясы ў свой час нанесла руйнуючы удар троцкістым, якія імкнуліся, спэкулюючы на часовых цяжкасьцях, убіць клін між пролетарыятам і яго партыяй; партыя выкрыла кулацкую сутнасьць правай опозіцыі, якая зьяўляецца найбольш небясьпечнай на даным этапе, абвясьціўшы аб несумяшчальнасьці поглядаў правага ўхілу з прыналежнасьцю да УсеКП(б), партыя наносіць руйнуючы ўдар і па права-„лявіцкім" бясьпрынцыпным блёку, які імкнецца пад прыкрыцьцем „левых" фраз атакаваць партыю з яўна правых фракцыйных позіцый.

Пад знакам разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі

ВІЦЕБСК, 12 (па тэлефону ад нашага корэспондэнта). Учора а 7-й гадзіне ўвечары адчынілася гарадзкая конфэрэнцыя комсамолу Віцебску. З дакладам аб рабоце ЦК ЛКСМБ выступіў тав. Рындзіч. Пасьля дакладу разгарнуліся спрэчкі. Выступаючыя з бальшавіцкай самакрытыкай выкрывалі недахопы працы організацыі. З першага пасяджэньня высьветлілася, што Віцебская гарорганізацыя побач з некаторымі посьпехамі мае шмат недахопаў.

Выступаючыя дэлегаты адзначалі, што комсамольская організацыя фабрыкі „Дзьвіна" напярэдадні развалу. Завод „Чырвоны Кастрычнік" ня вылез з прарываў. Гарком ЛКСМБ не кіраваў справай і падрыхтоўкай кадраў. Партыйраўніцтва не адчувалася. Трэба падкрэсьліць з рук вон ганебныя адносіны гаркому КП(б)Б да комсамолу. Нават на конфэрэнцыю не зьявіўся прадстаўнік гаркому КП(б)Б.

Уся праца конфэрэнцыі праходзіць пад знакам разгорнутай бальшавіцкай самакрытыкі, барацьбы за генэральную лінію партыі супроць ухілаў ад партыйнай лініі.

Абран ганаровы прэзыдыюм. Конфэрэнцыя паслала прывітальную тэлеграму ЦК УсеЛКСМ і „Комсамольской Правде", ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмене".

Ц. В.

„ДЭКАДА АБАРОНЫ"

ВАЕНІЗАЦЫЮ---У АСЯРОДАК УВАГІ

„ДЭКАДА АБАРОНЫ"—ПРАВЕРКА АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ САВЕЦКАГА САЮЗУ, ГАТОЎНАСЬЦІ ДАЦЬ РУЙНУЮЧЫ АДПОР УСІМ ТЫМ, ХТО ПАСЯГНЕ НА КРАІНУ БУДУЮЧАГАСЯ СОЦЫЯЛІЗМУ

Комсамол абавязан дабіцца карэннага палепшаньня вайсковай работы

Пад знакам узмацненьня работы ТДА-Авіахэму

З 15 па 20 лістапада г. г. Цэнтральным Саветам ТДА-Авіахэму СССР абвешчана „дэкада абароны". Ва ўмовах прымежнасьці нашай БССР з капіталістычным Захадам, гэта кампанія набывае выключна важнае політычнае значэньне.

Гіганцкія посьпехі ў галіне соцыялістычнага будаўніцтва, дасягнутыя пад выпрабаваным кіраўніцтвам партыі, ліквідацыя кулацтва, як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі, выклікаюць шалёнае супраціўленьне клясавых ворагаў унутры краіны і ашалелую падрыхтоўку імпэрыялістых да ўзброенага нападу на Савецкі Саюз. Таму з боку ўсёй працоўнай грамадзкасьці, асабліва комсамолу, рабочай і працоўнай моладзі павінна быць зьвернута асаблівая ўвага ў правядзеньні дэкады абароны.

Падрыхтоўчая праца і правядзеньне дэкады абароны павінна праходзіць у разрэзе шырока разгорнутай пропаганды і ўпартай практычнай рэалізацыі рашэньняў 13 зьезду КП(б)Б і 16 зьезду УсеКП(б) па пытаньню ўзмацненьня абараназдольнасьці краіны.

Праводзімая дэкада абароны павінна яшчэ больш палепшыць дапамогу комсамола ў рабоце ТДА-Авіахэму ў справе ваенізацыі працоўных. Лёзунг —100 проц. уступленьне комсамольцаў у шэрагі ТДА-Авіахэму ў дні дэкады абароны—павінен быць рэалізаваны. Комсамол павінен стаць сапраўдным застрэльшчыкам узмацненьня абараназдольнасьці СССР.

Неабходна заахвочваць ініцыятыву практычнага ўдзелу комсамолу ў справе ўзмацненьня абараназдольнасьці краіны. Вось прыклад Юравіцкай і Хоцімскай райорганізацыі, якія сабралі Юравіцкая 80 рублёў, Хоцімская 70 руб. на пабудову дырыжаблю „Клім Варашылаў", выклікаўшы на спаборніцтва іншыя райорганізацыі. У дні дэкады трэба організаваць зборы сродкаў на пабудову дырыжаблю, прыцягваючы да гэтай працы піонэрорганізацыю.

Лепшым удзелам у дэкадзе абароны з боку комсамолу павінна зьявіцца яшчэ большае павышэньне ўдарных тэмпаў у працы на вытворчасьці і колгасаў, у выкананьні прамфінпляну і гаспадарчых кампаній, памятуючы, што чым эканамічна мацней наша краіна, тым яна абараназдольней.

Праводзячы бязьлітасную барацьбу з правымі опортуністымі, якія імкнуцца да зьвёртваньня цяжкой індустрыі і колектывізацыі сельскай гаспадаркі, што прывяло-б да паслабленьня абараназдольнасьці СССР, мы павінны няўхільна ажыцьцяўляць генэральную лінію партыі ў справе шырока разгорнутага соцыялістычнага наступу забясьпечваючага ўзмацненьне абараназдольнасьці БССР.

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК ЛКСМБ

аб удзеле організацыі ЛКСМБ у правядзеньні дэкады абароны

Выходзячы з рашэньняў ЦК КП(б)Б аб удзеле ЛКСМБ у дэкадзе абароны, бюро ЦК ЛКСМБ прапануе:

1. Усім ГК і РК забясьпечыць актыўны ўдзел мас комсамолу, працоўнай моладзі ў дэкадзе абароны. Ставячы задачы павышэньня ўдзелу ЛКСМБ у соцбудаўніцтве, узмацніць работу па ваенізацыі ў адказ на ўзрастаючую вайсковую небясьпеку з боку капіталістычных краін.

2. Праводзімая дэкада абароны павінна яшчэ больш палепшыць сумесную работу комсамолу з ТДА-Авіяхімам у справе ваенізацыі, неабходна на работу ў РС ТДА-Авіяхіму вылучыць прадстаўнікоў комсамолу, замяніўшы тых, якія к рабоце сябе не апраўдалі.

Праверыць выкананьне дырэктывы аб стопроцантным уцягненьні комсамольцаў у сябры ТДА-Авіяхіму.

3. „Чырвонай Зьмене" правесьці агляд работы організацыі пад пунктам погляду: шэфства комсамол над малётам, АБВШ, а РК і ячэйкам у тым напрамку правесьці шэраг мерапрыемстваў.

4. Прапанаваць РК у час дэкады абароны забясьпечыць выкананьне дырэктывы ЦК ад 29-Х 30 г. справе ваенізацыі комсамолу.

5. Прапанаваць РК ЛКСМБ забясьпечыць прыцягненьне да ўдзелу ў дэкадзе абароны піонэрорганізацыі.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТЭСТАФЭТА

Нясем эстафэту уперад!

Фініш — IX зьезд Усе ЛКСМ

МАРШРУТ № 2

КАРЭННАГА ПЕРАЛОМУ НЯМА

Шэраг будуемых школ яшчэ не дабудаваны. Школы не забясьпечаны настаўнікамі і падручнікамі. Шэраг райорганізацый ЛКСМБ заслугоўваюць зьняцьця ганаровага звання шэфа

Разьбіваючы опортуністычную недаацэнку ўсеагульнага навучаньня—організацыі абавязаны дабіцца поўнай рэалізацыі плянаў усеабуча

Комсамол абвясьціў сябе шэфам усеагульнага навучаньня. Шэфства было выклікана тым, што правядзеньне ўсеагульнага навучаньня зьяўляецца вялікім актам у гісторыі барацьбы пераможцы пролетарыяту, які пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі ўпарта змагаецца як на фронце рэконструкцыі сваёй гаспадаркі так і на фронце культурнай рэволюцыі, зьмяняючы твар краіны, якая па волі цёмнага, рэакцыйнага, царскага рэжыму стала аднэй з адсталых, няпісьменных краін.

Савецкая краіна будуецца шпаркімі тэмпамі. Новая тэхніка, магутныя машыны,—вынік правільнай лініі партыі ў галіне індустрыялізацыі краіны,—патрабуюць, каб працоўная кляса была пісьменнай, магла сама будаваць сваю соцыялістычную гаспадарку.

Комсамол, узяўшы шэфства, абавязаў кінуць усе сілы на гэты фронт, з заўзятасьцю, якая ўласьціва комсамолу і працоўнай рабочай моладзі, змагацца з усімі перашкодамі, якія паўстануць на шляху правядзеньня ўсеагульнага навучаньня. Культэстафэта—галоўнае зьвяно ў барацьбе за ўсеагульнае навучаньне.

Штодзённыя зьвесткі з месц кажуць аб тым, што комсамол ня ўсюды яшчэ апраўдывае сваё шэфства, ня стаў на чале барацьбітоў за правядзеньне ўсеагульнага навучаньня. Школы да гэтага часу харчуюцца „Ясным Утром“,—старым падручнікам, які ні ў якім разе не адпавядае патрабаваньням нашай сучаснасьці. Падобныя падручнікі, разьлічаныя на мінулы пэрыод, на пэрыод адзінокага селяніна земляроба, беларускага саматужніка не адбіваюць нашага сучаснага жыцьця, магутных тэмпаў нашага будаўніцтва.

Цэлы шэраг, як комсамольскіх, так і гаспадарчых органаў выключна па-галавацяпску падыходзяць да будаўніцтва школ. Паданыя сёньня факты сьведчаць аб многім.

Гарадзкі комсамол, комсамол паасобных вытворчых прадпрыемстваў трымаюцца ў баку ад гэтай справы. Фрунзэўскі раённы камітэт комсамолу, абвясьціўшы культэстафэту, абмежаваўся надрукаваньнем маршрутаў. Ён яшчэ ні разу не абгаварыў і не праверыў удзелу комсамолу ў правядзеньні ўсеагульнага навучаньня. Ня лепш пастаўлена справа ў Кастрычнікаўскім райкоме, які таксама ў гэтай галіне бязьдзейнічае.

Досыць адзначыць, што цэлы шэраг прадпрыемстваў ня ведае аб прымацаваных да іх школах, вучотам не ахопленых школамі дзяцей да гэтага часу займаюцца часткова піонэры, але не комсамольскія ячэйкі.

Навучальны год ідзе ўжо два з паловай месяцы. Цёмная ганебная пляма на сьцягу нашага комсамолу гэтыя два з паловай месяцы. За гэты час комсамол не апраўдаў яшчэ званьне шэфа і ня здолеў як належыць паставіць справу поўнага ўсеагульнага абавязковага навучаньня.

Цэнтральныя комсамольскія органы павінны заняцца гэтым пытаньнем, праверыць, наколькі комсамольскія організацыі на мясцох спраўляюцца са званьнем шэфа і зрабіць з гэтага адпаведныя, як палітычныя, так і організацыйныя вывады.

Шэфства комсамолу над важнейшым палітычным мерапрыемствам ня ёсьць урачысты жэст. Галавацяпскія адносіны да гэтай справы—на руку опортуністым, якія ня вераць у нашыя сілы, і таму ўся наша комсамольская організацыя павінна даць ім рашучы адпор.

Пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі мы павінны і на гэтым фронце перамагчы.

Падшылі да справы...

„Чырвоная Зьмена“ ад 15 кастрычніка сыгналізавала аб прарывах на фронце правядзеньня ўсеагульнага навучаньня ў Вульскім раёне. Але, відаць, Вульскія кіраўнікі напляваецельскі глядзяць на гэтую справу, а сыгналы друку іх не датычаць. Як райком КСМ, так і інспэктар Нарасьветы павыразалі артыкулы і падшылі іх да справы для ... „архіўнай вартасьці“. А тым часам...

У раёне для 15 комплектаў не хапае 15 настаўнікаў. 6 школ зусім не адчынены, а ў астатніх ня ўсе комплекты працуюць. Аб мобілізацыі ўнутраных настаўніцкіх рэсурсаў зусім ня думаюць,—настаўнікі працуюць на розных пасадах і да гэтага часу не скарыстоўваюцца. Прыкладаў шмат.

Тав. Цынцапэр з 6-гадовым стажам працуе рэгістратарам у РК. Тав. Іваноў—рахункаводам, а 2-3 настаўнікі лічацца зусім беспрацоўнымі.

Лепабокі з райкому КСМ палец аб палец ня ўдарылі каб мобілізаваць комсамольцаў на пэдработу. Шмат комсамольцаў скончылі сямігодкі, іх можна было-б накіраваць настаўнікамі ў школы, ці на пэдкурсы, замест сказаць на іншую працу. Так, у райкоме КП(б)Б працуе тэхнічным сэкратаром комсамолец Гарбук, які скончыў першы курс пэдтэхнікуму. Ён хоча ісьці ў школу, але яго ня пушчаюць. Комсамолка-настаўніца Бараноўская да гэтага часу адмаўляецца ехаць у школу, а местачковая ячэйка ніякіх захадаў ня прымае.

Сельсаветы і комсамольскія ячэйкі злачынна бязьдзейнічаюць. Школы яшчэ да гэтага часу неатрымалі тавараў. Сабраныя сумы па самаабкладаньню ляжаць у сельсавеце не скарыстанымі. У Вульскім савеце ляжыць 1400 рублёў, у Сакалоўскім—700, Клечынскім—1000 р. і г. д.

Грамадзкая думка вакол усеагульнага навучаньня яшчэ ня складзена. Профсаюзныя і комсамольскія ячэйкі не праводзяць адпаведнае працы на гэтым фронце.

Батракі-вучні не наведваюць школы. Кулакі і заможнікі не адпускаюць з работы і ня выконваюць дагавароў. Профсаюз Рабземлесу на замку,—старшыня паехаў на курорт.

Спажывецкая коопэрацыя Вульскага раёну зрывае ўсеагульнае навучаньне. Ні ў аднэй школе не наладжаны гарачыя сьнеданьні.

Неабходна прыняць адпаведныя захады, каб ліквідаваць прарыў у правядзеньні ўсеагульнага навучаньня па Вульскім раёне. Злачынная бязьдзейнасьць раённай комсамольскай організацыі ня можа забясьпечыць пасьпяховае ажыцьцяўленьне гэтай важнейшай галіны культурнай рэволюцыі.

А. Усьміноні.

„Ясное утро“ у пашане...

У Вушацкім раёне няма зьвестак аб ахопе школамі дзяцей школьнага ўзросту.

Дзеці да гэтага часу не забясьпечаны абуткам і вопраткай ня гледзячы на досыць спрыяючыя гэтаму магчымасьці.

Назіраецца значны адліў дзяцей са школы.

Падручнікамі вучні не забясьпечаны. „Ясное Утро“ яшчэ дагэтуль пануе ў школах, ня гледзячы на тое, што ў гэтым падручніку шмат неадпаведных сучаснаму жыцьцю матар'ялаў.

Некаторыя школы яшчэ рамантуюцца і невядома калі будуць гатовы для заняткаў. Аб гарачых сьнеданьнях ніхто ня дбае.

Усеагульнае навучаньне зрываецца.

Кіраўнік штабу „ЛК“

Грыдзюшка Мік.

Нічога не зрабілі

Мы ўжо пісалі, што ўсеагульнае навучаньне ў Варавіцкім сельсавеце зрываецца. Але гэта не памагло, яшчэ ніякага пералому няма. Пастанова РВК адчыніць у вёсцы Камаровічы школу засталася на паперы. А вёска Камаровічы мае 300 двароў. 30 васьмігодак засталіся па-за школай. Абутак для вучняў ня прысланы. Сшыткаў і падручнікаў няма.

Для правядзеньня ўсеагульнага навучаньня комсамольская ячэйка, як шэф, нічога не зрабіла.

А. Рэзкі.

Апраўдаць шэфства

Комсамол узяў шэфства над правядзеньнем усеагульнага навучаньня, але Расанская організацыя на гэтае пытаньне не зьвяртае ўвагі. Многія ячэйкі і дагэтуль нічога ня робяць у галіне ажыцьцяўленьня шэфства. Патрэбна разгарнуць працу з тым, каб апраўдаць шэфства.

Р. К.

Забясьпечваюць зрыў

У вёсцы Ракава, Ліпаўскага сельсавету, Мазырскага раёну школа зачынена, бо няма настаўніка. 70 дзяцей школьнага ўзросту засталіся па-за школаю. На вёсцы няма ніводнага ліквідатара.

Неабходна заглянуць у гэтую вёску і прыцягнуць да адказнасьці тых людзей, якія бюрократычна адносяцца да ўсеагульнага навучаньня і забясьпечаньня настаўнікаў, такія адносіны ў далейшым могуць забясьпечыць поўны правал.

А. Кузьмянок.
П. Краўцоў.

Школа пабудавана, але...

У вёсцы Глушаковічы, Лельчыцкага раёну, усеагульнае навучаньне зрываецца. Да гэтага часу школа ня мае памяшканьня. Новая школа пачала будавацца яшчэ ў 1929 г., а дагэтуль ні печаў, ні вокан яшчэ не зрабілі.

РВК не паклапаціўся прысьпешыць будоўлю. Такія адносіны да школы могуць прывесьці да канчатковага зрыву ўсеагульнага навучаньня. Неабходна прыняць тэрміновыя захады.

Зорні.

35 проц. не ахоплена

У Калодзішчанскім сельсавеце 35 проц. дзяцей дашкольнага ўзросту не ахоплены школамі.

Некаторыя вёскі знаходзяцца на адлегласьці 6-7 кілёмэтраў ад школы. Дзеці ня маюць магчымасьці наведваць школу.

А. Верас.

... У 24 гадзіны

Будаўніцтва пачатковых школ у Расонскім і Гарбачэўскім раёнах сарвана. У Гарбачэўскім с.-с. будуецца сямігодка. Каб закончыць работу патрэбны былі яшчэ 4-5 дзён. У гэты-ж час РВК піша мясцоваму дзесятніку, каб той у 24 гадзіны зьняў з працы занятых на пабудове сямігодкі рабочых і накіраваў у РВК на нейкую другую пабудову. Такім чынам РВК сарваў будаўніцтва школы, чым фактычна сарваў справу ўсеагульнага навучаньня.

Адпаведныя органы павінны ўмяшацца ў гэтую справу з тым, каб школа была як найхутчэй пабудавана і магла распачаць заняткі.

Пчала.

Сярэдняя Азія ўключылася ў культпаход

На здымку: У інтэрнацыянальным клюбе комсамольцы растлумачваюць задачы культпаходу

Ёсьць пляны, няма працы

У Чэрвеньскім РК ЛКСМБ абраны штаб па правядзеньню ў раёне культэстафэты. Штаб дагэтуль ніякай працы не праводзіць. Ліквідацыя няпісьменнасьці і ўсеагульнае навучаньне зрываюцца.

26 кастрычніка на пленуме РК ЛКСМБ стаяла інформацыя інспэктара Нарасьветы тав. Зінковіча аб культэстафэце. Але інспэктар гэты час быў у Менску і інформацыя сарвалася.

Ракіта.

Распачалі працу

Ячэйка ЛКСМ Полацкага лясного тэхнікуму, разам з усімі вучнямі тэхнікуму, выступіла ў паход за ўсеагульнае навучаньне.

У падшэфным Грышаўскім сельсавеце праведзен вучот усіх няпісьменных і не ахопленых школамі дзяцей. На тэрыторыі сельсавету організавана 16 лікпунктаў.

Для працы ў лікпунктах ячэйка і профком вылучылі звыш 60 чалавек. Заняткі ўжо пачаліся.

Мялешка.

Сыгналізуем правал

Ні ў РК, ні ў райштабе няма дакладнага пляну правядзеньня культэстафэты па Лельчыцкім раёне. Райштаб ні разу ня зьбіраўся бо старшыня штабу тав. Шклярэнка і слухаць ня хоча аб культэстафэце.

Сыгналізуем правал культэстафэты па раёне.

Комсамол і профсаюзы нічога зрабілі для разгортваньня гэтай працы.

М. М.

„Чырвоная Зьмена“ дапамагла

• Допіс „Зьвярні ўвагу, рабачком“ цалкам пацьвердзіўся. Койданаўскі РК КП(б)Б паведамляе, што справа безгаспадарнасьці, бюрократызму, заціску самакрытыкі ў саўгасе Негарэлае разьбіралася ў РКК РСІ і РК КП(б)Б. Дырэктар саўгасу, сэкратар ячэйкі КП(б)Б і старшыня рабачкому з працы зьняты.

• Смалявіцкі РК КСМ паведамляе, што заметка аб сябру КСМ Целекаўцы пацьвердзілася. Целекавец выключан з КСМ.

• Дрыбінская КК РСІ паведамляе, што па заметцы „Дакуль будзе весьціся злачынства“ Славін зьняты з працы.

• Парыцкі РК КСМ паведамляе, што па допісу „Дэзэртыраў колектывізацыі вон з шэрагаў КСМ“ комсамолец А... лік выключан з шэрагаў КСМ.

• Тураўскі РК КП(б)Б паведамляе, што допіс „Што чуваць па Тураўскім раёне“ у асноўным пацьвердзіўся. З выключэньнем аб т. Царку, АПА Тураўскага РК КСМ Сухоцкі—з працы зьняты.

• Халопеніцкі РК КП(б)Б паведамляе, што па заметцы „Бандыты ўзумелі“ прыняты захады да перавыбараў новага старшыні колгасу, замест Казака, які судзіўся за бандытызм.

• Койданаўская РКК РСІ паведамляе, што допіс „Бюрократычныя адносіны да працы“ пацьвердзіўся. Прэзыдыум РВК абвясьціў вымову загадчыку Райкомгасу.

Паведамленьні

З 8 га лістапада 1930 года ў памяшканьні Саніт.-Гігіенічнага Ін-ту (Унівэр. Гарадок, Мэдкорпус 3-ці паверх) адчынена выстаўка дадатковых харчавых продуктаў: соі і дражджоў.

Выстаўка адчынена ад 9-ці гадзін раніцы да 4 гадзін дню, у іншыя гадзіны па згадненьню. Групам даведнікаў даюцца супрацоўнікамі Ін-ту адна сдвыя тлумачэньні.

Дырэктар Інстытуту.

Фрунзэўская РКК КП(б)Б—РСІ сумесна з ФРК ЛКСМБ склікае 15 лістапада 1930 г., а 7 гадз. ўвечары, у зале паседжаньняў КП(б)Б зьлёт „лёгкіх кавалерыстаў“ Фрунзэўскага раёну.

Яўка ўсіх „ЛК“ абавязкова.

ФРК КП(б)Б, ФРК ЛКСМБ.

Адказны рэдактар—
Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 594